**Крыніцы**

БелЭн : Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2003. – 18 т.

Бір. 1969: Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія. Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 505 с.

СПЗБ: Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча : у 5 т. / рэдкал.: Ю. Ф. Мацкевіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979–1986. – 5 т.

ТСБМ: Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / рэдкал.: К. К. Атраховіч [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1977–1984. – 5 т.

**І.Л. Капылоў**
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі
e-mail: iharkap@gmail.com

УДК 811.161.3’373.21

## МІКРАТАПАНІМІЯ БЕЛАРУСКАГА ПААЗЕР’Я ЯК ВАЖНАЯ КРЫНІЦА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА ЛАНДШАФТУ РЭГІЁНА

Ключевые слова: *Микротопоним, регион, историко-культурное наследие, краеведение, ономастический атлас.*

*В статье обосновывается необходимость сохранения микротопонимии Белорусского Поозерья как важной составляющей историко-культурного наследия белорусов.*

**I.L. Kapylou**
The Center for the Belarusian Culture,
Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus

## MICROTOPONYMY OF THE BELARUSIAN PAAZIERJE AS AN IMPORTANT SOURCE OF HISTORICAL AND CULTURAL LANDSCAPE OF THE REGION

Key words: *Microtoponym, region, historical and cultural heritage, regional studies, onomastic atlas.*

*The article substantiates the need to preserve the microtoponymy of the Belarusian Paazierje as an important part of historical and cultural heritage of Belarusians.*

Вывучэнне агульнай анамастычнай сістэмы той або іншай этнічнай супольнасці немагчыма без глыбокага даследавання рэгіянальных падсістэм з уласцівымі ім спецыфікай і заканамернасцямі ўтварэння, функцыянавання і змянення тапанімічных адзінак. Вялікая перспектыва ў вырашэнні актуальных лінгва-этнаграфічных праблем бачыцца ў зборы і вывучэнні аднаго з найбольш адметных анамастычных класаў – мікратапонімаў. Франтальны збор, сістэматызацыя і навуковае апісанне нацыянальнай мікратапаніміі застаецца найважнейшай задачай сучаснай анамастыкі. Актуальнасць вырашэння гэтай задачы абумоўлена тым, што мікратапонімы адносяцца да самага ўразлівага разраду онімаў: у большасці сваёй яны не фіксаваліся ў пісьмовых крыніцах, а зафіксаваныя з цягам часу страчваліся або пераходзілі ў разрад іншых онімаў, у першую чаргу айконімаў. Мікратапонімы, як правіла, вядомы абмежаванаму колу людзей, яны маюць невялікі арэал распаўсюджання. Сітуацыя абвастраецца тым, што на сучасным этапе адбываецца масавае знікненне населеных пунктаў. Змена пакаленняў і адпаведна адыход прадстаўнікоў старэйшага пакалення, якія добра ведалі назвы малых тапааб’ектаў, ужо прывялі да



Репозиторий БГУ

дэградацыі мікратапанімічнай сістэмы, а ў бліжэйшай перспектыве прывядуць да поўнага знікнення гэтай важнай катэгорыі онімнай лексікі.

Нягледзячы на павышаную цікавасць да анамастычнай лексікі ў апошнія дзесяцігоддзі і вялікую колькасць дысертацыйных работ, прысвечаных розным аспектам функцыянавання онімных адзінак, да цяперашняга часу мікратапанімія застаецца адным з найменш даследаваных раздзелаў анамастыкі. На сённяшні дзень абследавана толькі 13 са 118 раёнаў Беларусі. Па мікратапанімічнай праблематыцы абаронена толькі 6 дысертацый (Я. М. Адамовіч (1965), А. М. Прышчэпчык (1970), В. М. Емельяновіч (1982), Г. А. Іванова (1986), А. І. Копач (2004), В. А. Шклярык (2017) і некалькі работ, у якіх мікратапанімічны матэрыял прыцягваецца ў якасці дадатковай крыніцы даследавання (дысертацыйныя даследаванні Н. А. Багамольнікавай (1997), Т. М. Аліферчык (2011). У асноўным праведзена навуковае даследаванне мікратапапніміі тэрыторыі Палесся і невялікай часткі цэнтральнай Беларусі.

Не атрымаў шырокага развіцця і такі напрамак як мікратапанімічная лексікаграфія. Беларуская мікратапанімія сістэмна апісана толькі ў 5-ці слоўніках: “Анамастычны слоўнік Гродзеншчыны”, ч. 1, пад рэдакцыяй П. У. Сцяцко (2005); А. А. Іванова “Микротопонимия Мозырского Полесья” (2007); “Мікратапанімія Беларусі. Матэрыялы” (1974); В. І. Рагаўцоў, С. Я. Кечык “Анамастычны слоўнік Магілёўшчыны” (2000), “Слоўнік мікратапонімаў Магілёўшчыны” (2004). Падборкі мікратапонімаў змешчаны ў працы Вярэніча В. Л. “Палескі архіў” (2009), “Матэрыялах для/да слоўніка гідронімаў Гомельшчыны” (1987–1997), серыі публікацый С. Н. Прача у газеце «Светлагорскія навіны» (1991–1994), “Тураўскім слоўніку”, том 5 (1987), кнізе А. П. Цыхуна “Скарбы народнай мовы (з лексічнай спадчыны насельнікаў Гродзенскага раёну)”. У навуковы зварот уведзены корпус уласных назваў дробных геаграфічных аб’ектаў аб’ёмам больш за 30 000 адзінак (для параўнання колькасць даследаваных мікратапонімаў у Я. М. Адамовіча складае 4800, у Г. М. Прышчэпчык – больш за 4000, у В. М. Емельяновіч – каля 7000, у Г. А. Івановай – 4405, у В. А. Шклярыка – 3000). Аднак гэта толькі невялікі працэнт таго мікратапанімічнага фонду, які патрабуе неадкладнай лексікаграфічнай сістэматызацыі і апісання.

Патрабуюць удакладнення і асобныя палажэнні анамастычнай тэорыі. У прыватнасці, да цяперашняга часу канчаткова не вызначаны статус мікратапоніма як анамастычнай катэгорыі. Неаднастайна трактуюцца мікратапонімы ў навуковай літаратуры. Нават сярод славянскіх анаматолагаў няма адзінства ў вызначэнні паняцця *мікратапонім*: у многіх работах усходнеславянскіх вучоных мікратапонімы разглядаюцца як уласныя найменні заселеных і незаселеных мікратэрыторый, у заходнеславянскіх даследаваннях прыярытэт аддаецца поглядам, паводле якіх да мікратапонімаў адносяць толькі назвы мікрааб’ектаў незаселеных мясцовасцей. Спрэчным застаецца пытанне, ці правамерна адносіць да мікратапонімаў назвы ўнутрыгарадскіх аб’ектаў. Выклікаюць дыскусію пытанні адносна таго, якія крытэрыі браць за аснову пры аднясенні назвы таго або іншага геаграфічнага аб’екта да мікратапонімаў: яго памеры ці толькі ступень вядомасці.

З усіх рэгіёнаў Беларусі мікратапанімія Віцебскай вобласці вывучана ў найменшай ступені. У вобласці налічваецца 6 480 сельскіх населеных пунктаў, з іх 366 – без насельніцтва. Сярод сельскіх населеных пунктаў пераважаюць невялікія паселішчы – з колькасцю жыхароў да 10 чалавек. Такіх населеных пунктаў яшчэ 12 гадоў назад было 4718, або 73 % ад агульнай колькасці [3]. Дадзеная сітуацыя сведчыць пра дынамічныя незваротныя працэсы страты мікратапонімаў рэгіёна. Ні ў адным з 21 раёнаў вобласці не праводзілася планамернае і сістэмнае вывучэнне мікратапонімаў, за выключэннем асобных краязнаўчых даследаванняў і конкурсных работ школьнікаў. Адносна невялікай колькасцю прыкладаў у параўнанні з іншымі рэгіёнамі Беларусі прадстаўлены мікратапонімы Віцебшчыны і ў кнізе “Мікратапанімія

Беларусі. Матэрыялы” (1974), якая ўключае матэрыялы, сабраныя ў перыяд з 1948 па 1972 гады ў сувязі з вывучэннем беларускіх народных гаворак – пры збіранні матэрыялу для “Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы”, “Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа” і “Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак”.

Неабходнасць збору, сістэматызацыі, класіфікацыі і навуковай інтэрпрэтацыі анамастычных фактаў з тэрыторыі Віцебскай вобласці з прыцягненнем даных этнаграфіі, археалогіі, антрапалогіі і іншых навук прадыктавана ўнікальнасцю тэрыторыі Беларускага Паазер'я. Самабытнасць Падзвіння як гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі абумоўлена комплексам важных фактараў: 1) рэгіён адпавядае асноўнаму масіву старажытнай Полацкай зямлі, якая ў складзе Кіеўскай Русі была найбольш самастойнай з уласцівымі ёй векавымі традыцыямі грамадска-палітычнага ладу і арыгінальнай культурай [2, с. 460]; 2) менавіта за падзвінскімі і падняпроўскімі ваяводствамі і паветамі ВКЛ з канца 1620 замацавалася назва Белая Русь, якая з цягам часу перайшла на ўсю сучасную тэрыторыю дзяржавы [2, с. 460]; 3) Падзвінне характарызуецца поліканфесійнасцю: жыхары заходніх раёнаў Віцебшчыны доўгі час заставаліся язычнікамі, большасць насельніцтва прытрымлівалася праваслаўя, а з другой паловы 16 ст. пашырылася каталіцтва, павялічыліся землеўладанні езуітаў. На землі Віцебшчыны ў другой палове 17 ст. перасяліліся стараверы, не прыняўшы царкоўную рэформу патрыярха Нікана і цара Аляксея Міхайлавіча; 4) гаворкі Віцебшчыны характарызуюцца сваёй неаднароднасцю паводле лексічнага складу, фанетычных і граматычных асаблівасцей: на тэрыторыі вобласці вылучаюцца два асноўныя ўнутрыдыялектныя тыпы – віцебска-магілёўскі і полацка-мінскі; 5) Падзвінне вылучаецца адметнай традыцыйна-бытавой культурай, якая складвалася на працягу стагоддзяў і ўвабрала ў сябе не толькі агульнабеларускія рысы, але і спецыфіку мясцовых гістарычных і прыродных умоў [2, с. 460]; 6) унікальнасць рэгіёна заключаецца ў тым, што Віцебшчына мяжуе з трыма дзяржавамі – Літвой, Латвіяй і Расіяй, а пагранічча заўсёды ўяўляе сабой складаны сацыякультурны феномен, для якога характэрна ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў розных груп людзей, іх культур, светапоглядаў і моў.

Такім чынам, даследаванне мікратапнiміі Падзвіння ў кантэксце ўсяго комплексу складнікаў гісторыка-культурнай спадчыны дазволіць захаваць вялікі пласт духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларускага Паазер'я як аднаго са старажытных і ўнікальных этнакультурных рэгіёнаў Славіі. Вынікі даследавання маюць шырокія перспектывы далейшага выкарыстання:

1. *Нарматыўна-прававы аспект.* На сённяшні дзень у найбольшай ступені распрацавана прававая база захавання аднаго з разрадаў уласных імён – тапонімаў. Прыняты ў 2010 годзе Закон Рэспублікі Беларусь “Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў” вызначае прававыя асновы захавання ўласных геаграфічных назваў як неад'емнай часткі гісторыка-культурнай спадчыны [1]. Абапіраючыся на палажэнні Закона, неабходна распрацаваць крытэрыі аднясення тапонімаў Паазер'я да помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны і з улікам гэтых крытэрыяў сфарміраваць базу ўласных геаграфічных назваў рэгіёна, якія падлягаюць ахове з боку дзяржавы.

2. *Лексікаграфічны аспект.* Сабраны вялікі мікратапанімічны матэрыял у перспектыве можа быць сістэматызаваны і адлюстраваны ў электронным зводным анамастычным слоўніку Падзвіння. Акрамя таго, актуальным уяўляецца праект, скіраваны на стварэнне электроннай анамастычнай базы Паазер'я, якая будзе ўключаць розныя класы ўласных імён з прывязкай іх да мясцовасці, а таксама змяшчаць максімальна поўныя звесткі (лінгвістычныя, гістарычныя, геаграфічныя, этнаграфічныя, культуралагічныя, сацыялагічныя, літаратуразнаўчыя і інш.) пра пэўныя анамастычныя адзінкі і спецыфіку абазначаемых імі аб'ектаў.

3. *Лінгвагеаграфічны аспект.* Перспектыўным напрамкам беларускай анамастыкі з'яўляецца падрыхтоўка і стварэнне “Анамастычнага атласа Беларусі”, матэрыялы якога



Рэпазіторый ВДУ

знойдуць шырокае выкарыстанне пры ўкладанні "Агульнаславянскага анамастычнага атласа". Першымі крокамі па рэалізацыі дадзенага напрамку могуць быць рэгіянальныя атласы, напрыклад, "Анамастычны атлас Палесся", "Анамастычны атлас Падзвіння" і інш., якія дазволяць атрымаць поўнае прасторавае (картаграфічнае) уяўляенне пра арэал пэўных структурных тыпаў і асноў онімаў. Стварэнне такога тыпу атласаў адкрые новыя магчымасці ў даследаваннях па дыялекталогіі, гістарычнай лексікалогіі, этнаграфіі.

3. *Краязнаўча-адукацыйны аспект.* Уключэнне анамастычнага матэрыялу ў праграмы факультатываў па беларускай мове школ Віцебшчыны дапаможа праз паглыбленне ведаў аб уласных імёнах пашырыць веды пра родны край, павысіць кругагляд вучняў і сфарміраваць іх краязнаўчую кампетэнцыю, абудзіць цікавасць да гісторыка-культурнай спадчыны малой радзімы, паспрыяе фарміраванню нацыянальнай свядомасці і патрыятычнаму выхаванню.

Такім чынам, на сённяшні дзень сітуацыя вымагае прыняцця адпаведнай дзяржаўнай праграмы па зборы мікратапаніміі Паазер'я, у выкананні якой павінны быць задзейнічаны акадэмічныя вучоныя-анаматолагі, выкладчыкі і студэнты Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, мясцовыя краязнаўцы і работнікі сельсаветаў. Адказнасць за забеспячэнне рэалізацыі праграмы павінна быць ускладзена на мясцовыя органы кіравання.

**Літаратура**

1. Закон Рэспублікі Беларусь "Аб найменнях геаграфічных аб'ектаў", 16 лістапада 2010 г. № 190-З. Мінск, 2010. – 15 с.

2. Цітоў, В. С. Паазер'е / В. С. Цітоў // Беларуская энцыклапедыя ў 18 тамах. – Том 11. – Мінск : "Беларуская энцыклапедыя, 2000. – 559 с.

3. https://ru.wikipedia.org/Витебская_область.

**В.С. Картавенко**
Смоленский государственный университет
e-mail: vera-kartavenko@yandex.ru

УДК 81'373.21

## ЦЕННОСТНЫЕ ОРИЕНТАЦИИ В РЕГИОНАЛЬНОМ ТОПОНИМИЧЕСКОМ МАТЕРИАЛЕ

Ключевые слова: *название, памятники письменности, Смоленский край, лексика, топоним, топонимия, микротопоним.*

*В статье впервые осуществляется исследование названий населенных пунктов Смоленского края XVI–XVIII веков, которые отразили ценностные ориентации в своем содержании. Таковыми являются топонимы и микротопонимы, связанные с процессами земледелия.*

**V.S. Kartavenko**
Smolensk State University

## VALUE ORIENTATION IN REGIONAL TOPONYMIC MATERIAL

Key words: *name, written records, Smolensk region, vocabulary, toponym, toponymy, microtoponym.*

Репозиторий ВГУ